А-1
442

Министерство труда Республики Беларусь

Главное управление Государственной службы занятости

Республиканский научно-методический и учебный центр "Алгоритм"

# "ПРОБЛЕМЫ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПЕРЕПОДГОТОВКИ БЕЗРАБОТНЫХ"

II Республиканская научно-практическая конференция

Минск, 19-20 декабря 1996г.

Тезисы докладов

Минск 1996

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРОБЛЕМЫ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПЕРЕПОДГОТОВКИ БЕЗРАБОТНЫХ

II Республиканская научно-практическая конференция

Минск, 19-20 декабря 1996г.

Тезисы докладов

© РНМУЦ "Алгоритм", 1996

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Амялькоў А.А. Аб неабходнасці дыягностыкі развіцця асобы ў прафесійнай перападрыхтоўцы беспрацоўных ва ўмовах навукова-метадычнага вучэбнага цэнтра ... 83

Амялькоў А.А. Голубеў С.Г. Сацыяльна-псіхалагічныя асновы прафесійнай перападрыхтоўкі беспрацоўных ... 85

Пусель В.В. Профессиональная подготовка инвалидов, как средство их социальной реабилитации ... 87

Сапего Т.С. Проблемы трудоустройства инвалидов в сфере малого и среднего бизнеса ... 88

Ефимов В.Д. Информационное обеспечение по проблемам трудоустройства инвалидов в деятельности БелОИ ... 89

Шпырко Л.В. Трудоустройство - конечная цель профессиональной переподготовки безработных ... 90

Гофман М.Ф. Реализация плана эксперимента по организации самозанятости безработных в рамках мероприятий программы ТАСИС ... 91

Ананько Н.В., Голубев С.Г. Зарубежный опыт профессионального консультирования в Государственной службе занятости ... 92

Сезина В.Д. Правовая защита доходов и эффективной занятости населения в развитых странах ... 93

Крюкова К.С. Международный аспект финансирования рынка труда в Республике Беларусь ... 94

Васькова Т.А. Профессиональное обучение незанятого населения в России ... 95

# САЦЫЯЛЬНА-ПСІХАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ПРАФЕСІЙНАЙ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ БЕСПРАЦОЎНЫХ

А.А.Амялькоў, С.Р.Голубеў
РНМВЦ "АЛГАРЫТМ",г.Мінск

У сучаснай сістэме перападрыхтоўкі беспрацоўных вялікая ўвага ўдзяляецца набыццю імі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў па спецыяльнасцях, на якія ёсць попыт на рынку працы. Сагласна рэспубліканскай праграме занятасці ў 1996 годзе на прафесійную перападрыхтоўку беспрацоўных было накіравана 17,8 тыс. чалавек. Але веды, якія набываюцца беспрацоўнымі ў вучэбных цэнтрах могуць быць не запатрабаванымі па суб`ектыўных прычынах. Чалавек, які атрымаў, на першы погляд, усе неабходнае для новай прафесіі, часам не можа не толькі ўладкавацца на працу, але і не пераадолець сябе ў пошуку працы па набытай спецыяльнасці. Аб гэтым, напрыклад, сведчыць тое, што за 9 месяцаў бягучага года прафесійную перападрыхтоўку ў рэспубліцы прайшло 14,6 тыс. чалавек, але толькі 7,7 тыс. з іх было працаўладкавана. Патрэбна, тым не менш, адзначыць, што і гэтая лічба працаўладкаваных не маленькая, але, на наш погляд, яна магла б быць яшчэ большай. Каб павялічыць эфектыўнасць працы вучэбных цэнтраў, неабходна надаць больш увагі, па першае, псіхалагічнай падрыхтоўцы асобы да змены прафесіі і, па другое, фарміраванню сацыяльна-псіхалагічнай падрыхтаванасці да ўзаемадзеяння ў новых умовах, якія чакаюць яе па месцы новай працы.

У вучэбных планах і навукова-метадычных матэрыялах, якія распрацоўваюцца ў вучэбных цэнтрах, неабходна адводзіць больш месца для псіхалагічнай падрыхтоўкі слухачоў. У час навучання неабходна дапамагчы беспрацоўным усвядоміць асаблівасці сваіх матываў (свядомых і несвядомых) выбару прафесіі, сваіх здольнасцяў, даць

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

слухачам элементарныя прадстаўленні аб сацыяльна-псіхалагічнай перцэпцыі і рэфлексіі, вучыць іх развіваць у міжасобасных зносінах сістэму спрыяльных да сябе адносін у любым новым сацыяльным асяроддзі.

У мэтах павышэння эфектыўнасці дзейнасці вучэбных цэнтраў неабходна не толькі падрыхтаваць беспрацоўнага па новай прафесіі, але аказаць яму метадычную дапамогу ў пошуку працы і замацаванні яго на новым месцы. Для гэтага мэтазгодна ў вучэбных цэнтрах і ў тым ліку ў Рэспубліканскім навукова-метадычным і вучэбным цэнтры "Алгарытм" стварыць умовы для кансультацый на перыяд пошуку працы і адаптацыі на новым працоўным месцы ўсім тым, хто ў гэтых навуковых установах атрымаў новую спецыяльнасць. Сістэма кансультацый можа дапамагчы беспрацоўным у працаўладкаванні і будзе прадастаўляць карысную для ўсіх вучэбных цэнтраў інфармацыю, аналіз якой дазволіць выказаць аптымальныя падыходы ў арганізацыі іх навукова-метадычнай і вучэбнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ